# БЛІЗКІЯ АПЕНІНЫ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Супрацоўніцтва паміж Беларуссю і Ватыканам таксама актыўна развіваецца. Раней, у 2009 годзе, Аляксандр Лукашэнка ўжо наведваў Ватыкан і сустракаўся з Бенедзіктам XVI, папярэднікам Папы Рымскага Францыска. Беларусь з візітам таксама не раз наведвалі высокапастаўленыя прадстаўнікі Ватыкана. У сакавіку мінулага года Беларусь наведваў Дзяржаўны сакратар Ватыкана кардынал П'етра Паралін.

У Святым Прастоле добра разумеюць, што менавіта наша краіна, у якой спрадвеку мірна суіснуюць розныя канфесіі, можа ў гэты неспакойны час стаць надзейнай апорай для захавання міжканфесійнай згоды і на кантыненце, і ва ўсім свеце.

Таму не дзіўна, што каля трапа самалёта Прэзідэнта Беларусі сустракалі прадстаўнікі абедзвюх дзяржаў — паўнамоцны міністр службы дыпламатычнага пратакола Міністэрства замежных спраў і міжнароднага супрацоўніцтва Італіі Крысціяна Катафаві, асабісты прадстаўнік Папы Рымскага, аргенцінскі дырэктар пратакола Гільерма Кархер і прадстаўнік Дзяржаўнага сакратара Ватыкана Файман Дэнэлі.

Ужо ў аэрапорце кіраўнік беларускай дзяржавы правёў кароткую размову з Крысціяна Катафаві, падчас якой прапанаваў італьянскаму бізнесу больш актыўна інвеставаць у Беларусь. «Калі я бываю ў іншых дзяржавах, заўсёды прапаную пачынаць з малога. Два-тры праекты пад маю адказнасць. Я буду кантраляваць іх развіццё. Калі вам гэта спадабаецца, прапануйце больш», — сказаў Прэзідэнт. Прадстаўнік МЗС Італіі пагадзіўся. «Трэба пачынаць з гэтых двух-трох праектаў і з тых галін, якія ўяўляюць узаемны інтарэс», — сказаў ён.

Падчас перагавораў Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі і Прэзідэнта Італіі Серджа Матарэла, якія прайшлі ў Квірынальскім палацы ў Рыме, бакі разгледзелі ўвесь спектр беларуска-італьянскіх адносін з акцэнтам на гандлёва-эканамічнае і інвестыцыйнае ўзаемадзеянне, развіццё кааперацыйных сувязяў.

Абмяркоўвалася таксама магчымасць стварэння бізнес-савета. Прапанову аб фарміраванні падобнай структуры агучыў беларускі лідар. На думку Аляксандра Лукашэнкі, такі савет дапамог бы зняць многія пытанні ва ўзаемадзеянні бізнес-структур. Прэзідэнт Італіі ў сваю чаргу падтрымаў ідэю, адзначыўшы, што гэта быў бы выдатны інструмент для садзейнічання супрацоўніцтву ў сферы бізнесу і рашэнні розных пытанняў.

Як было адзначана падчас сустрэчы, у развіцці шматбаковага ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва зацікаўлены як Беларусь, так і Італія. «Беларусь заўсёды будзе донарам стабільнасці і прыстойнасці ў адносінах як да Італіі, так і Еўрасаюза ў цэлым», — падкрэсліў беларускі лідар.

Улічваючы вялікую цікавасць італьянскага бізнесу да Беларусі, Аляксандр Лукашэнка запэўніў у гатоўнасці дзейнічаць у гэтым кірунку. Асаблівую цікавасць для Беларусі ўяўляе вопыт Італіі ў стварэнні малых і сярэдніх прадпрыемстваў у самых розных сферах, у тым ліку ІТ, АПК, вытворчасці і перапрацоўцы сельскагаспадарчай прадукцыі і іншых. Адзначана, што на аснове гэтых прадпрыемстваў у тым ліку неабходна ствараць трывалы падмурак для міждзяржаўнага ўзаемадзеяння.

Асобным пунктам у парадку дня абмяркоўвалася павелічэнне аб'ёмаў інвестыцыйнага супрацоўніцтва, стварэння на тэрыторыі Беларусі не толькі сумесных, але і ўласных італьянскіх прадпрыемстваў. «Мы гатовы прадаставіць для гэтага ўсе неабходныя ўмовы», — сказаў кіраўнік беларускай дзяржавы.

У свой час абмяркоўвалася магчымасць стварэння ў Брэсце італьянскага прамысловага парка. Бакі пагадзіліся з неабходнасцю вярнуцца да прапрацоўкі гэтага праекта, для рэалізацыі якога з боку Беларусі будуць створаны ўсе ўмовы.

У паспяховай рэалізацыі гэтага і іншых праектаў ёсць несумнеўны інтарэс і італьянскага боку, улічваючы членства Беларусі ў Еўразійскім эканамічным саюзе. Гэта значыць, фактычна для італьянскіх тавараў, вырабленых на тэрыторыі Беларусі, будзе адкрыты ўвесь еўразійскі рынак.

Прэзідэнты пагадзіліся, што для больш эфектыўнага супрацоўніцтва па шэрагу напрамкаў неабходна ўдасканальваць нарматыўна-прававую базу, рабіць яе больш паўнавартаснай.

Асобным блокам кіраўнікі дзяржаў абмяркоўвалі ўзаемадзеянне ў сацыяльнай сферы. Аляксандр Лукашэнка падзякаваў Серджа Матарэлу за дапамогу італьянскага боку ў аздараўленні беларускіх дзяцей. Італія ў сваю чаргу ўдзячная Беларусі за канструктыўнае ўзаемадзеянне ў сферы ўсынаўлення дзяцей.

Прэзідэнты не абмінулі і актуальныя пытанні міжнароднага парадку дня, у тым ліку сітуацыю ва Украіне. «Мінск — гэта зямля, якая абяцае надзею на вырашэнне гэтага канфлікту», — сказаў Прэзідэнт Італіі.

У цэлым Аляксандр Лукашэнка падзякаваў італьянскаму боку за тое, што Італія заўсёды прытрымлівалася прыстойнай і стрыманай пазіцыі ў дачыненні да Беларусі. Кіраўнік беларускай дзяржавы запрасіў Серджа Матарэлу наведаць Беларусь у любы зручны час.

У сваю чаргу Прэзідэнт Італіі падзякаваў за запрашэнне і выказаў задавальненне тым, што Беларусі і Італіі ўдалося захаваць канструктыўныя адносіны супрацоўніцтва.

Сёння, падчас візіту Прэзідэнта Беларусі ў Дзяржаву Ватыкан запланавана яго сустрэча з Папам Рымскім Францыскам. На сустрэчы будзе абмяркоўвацца далейшае развіццё супрацоўніцтва Беларусі з Рымска-каталіцкай царквой.

**Паводле БЕЛТА.**

■ Кантэкст

# ПРЫЯРЫТЭТЫ РАЗВІЦЦЯ ЕАЭС

**Прэм'ер-міністр Рэспублікі Беларусь Андрэй Кабякоў узяў удзел у пасяджэнні Еўразійскага міжурадавага савета, якое прайшло ў Ерэване.**

На парадку дня было каля 10 пытанняў. У прыватнасці, разгледжана канцэпцыя фарміравання агульных рынкаў нафты і нафтапрадуктаў Еўразійскага эканамічнага саюза, пытанні ўвозу і абарачэння тавараў на мытнай тэрыторыі ЕАЭС у сувязі з далучэннем Рэспублікі Казахстан да Сусветнай гандлёвай арганізацыі.

Апрача іншага разгледжаны тэрміны падрыхтоўкі Дагавора аб Мытным кодэксе Еўразійскага эканамічнага саюза.

Паводле слоў Андрэя Кабякова, пастаяннае зацягванне адпаведных перамоў прыводзіць да перагляду ўжо дасягнутых дамоўленасцяў: «У выніку мы топчамся на месцы, калі не адкочваемся назад. Неабходны выразныя часовыя арыенціры».

Як лічыць беларускі прэм'ер-міністр, аптымальнай датай завяршэння падрыхтоўкі Мытнага кодэкса бачыцца 1 снежня 2016 года.

# МОЛАДЗЬ — ЛЕПШЫЯ ІНВЕСТЫЦЫІ Ў БУДУЧЫНЮ

V Усебеларускі народны сход

## У Магілёве вылучылі 124 дэлегаты на V Усебеларускі народны сход

**Па ўрачыстасці мерапрыемства нагадвала свята ў добрых традыцыях. Да паслуг яго ўдзельнікаў працавалі кропкі грамадскага харчавання, прапаноўвалася сувенірная прадукцыя, адбыўся канцэрт. Напярэдадні ў працоўных калектывах прадпрыемстваў, арганізацый і ўстаноў горада прайшло больш за 300 сходаў і канферэнцый, дзе былі абраны 1000 упаўнаважаных. Амаль усе яны прысутнічалі на гарадскім сходзе. Толькі ад Магілёўхімвалакна прыйшло 60 упаўнаважаных. І гэта з ліку 270, якія мелі ўсе шанцы апынуцца на іх месцы. Удзел у форуме прынялі старшыня Магілёўскага аблвыканкама Уладзімір ДАМАНЕЎСКІ, міністр архітэктуры і будаўніцтва Анатоль ЧОРНЫ і міністр па надзвычайных сітуацыях Уладзімір ВАШЧАНКА, члены Савета Рэспублікі і Нацыянальнага сходу Беларусі.**

Перад тым, як агучыць, хто будзе прадстаўляць Магілёў на V Усебеларускім народным сходзе, старшыня Магілёўскага гарвыканкама Уладзімір Цумараў распавёў, якіх вынікаў дасягнуў за апошнія 5 гадоў абласны цэнтр. Павышэнню эканамічнай эфектыўнасці прадпрыемстваў горада садзейнічала іх мадэрнізацыя, прыцягненне інвестыцый. Асабліва паспяхова вызначыліся Магілёўхімвалакно, Магілёўліфтмаш, Магатэкс, іншыя флагманы эканомікі рэгіёна. На працягу 5 гадоў прадпрыемствы Магілёва вялі знешнегандлёвыя аперацыі са 105 краінамі свету, тавары пастаўляліся на рынкі 51 дзяржавы. Упершыню гандлёвыя стасункі ўсталяваліся з Грэцыяй, Харватыяй, Пакістанам, Аб'яднанымі Арабскімі Эміратамі, Японіяй, Паўднёвай Карэяй. Рэалізавана шмат сацыяльных і культурных праектаў. Штогод у Магілёве праходзіць больш за 20 розных фестываляў, форумаў і конкурсаў, сярод якіх далёка вядомыя за межамі краіны М@rt.кантакт, «Анімаёўка», свята духоўнай музыкі «Магутны Божа», «Залаты шлягер». За пяцігодку ў горадзе адкрыліся 4 дзіцячыя садкі, узведзена школа ў маладзёжным мікрараёне «Спадарожнік». Шмат дасягненняў адбылося ў спорце. На розных спаборніцтвах магіляўчане заваявалі 40 медалёў рознай вартасці. Актыўна развіваецца ў горадзе малы і сярэдні бізнес. Сёння ў гэтай сферы задзейнічана больш за 50 тысяч чалавек, трэцяя частка актыўнага насельніцтва горада. Паслугамі службы занятасці за 5 гадоў скарысталіся каля 47 тысяч магіляўчан, больш як 80% беспрацоўных атрымалі новыя прафесіі, якія запатрабаваны на рынку працы. Толькі сёлета ў горадзе было створана 1630 новых працоўных месцаў.

**Вольга СІНЯКІНА, вядучы спецыяліст упраўлення па ідэалагічнай рабоце і кадрах Магілёўхімвалакна.**

Кожны з амаль што тысячы прысутных на форуме мог бы годна прадставіць Магілёўшчыну на рэспубліканскім узроўні. Зала прагаласавала за 124 кандыдаты ў дэлегаты. З іх 11 чалавек — прадстаўнікі гіганта хімічнай галіны Магілёўхімвалакна. У тым ліку генеральны дырэктар прадпрыемства Пётр Руднік і яго першы намеснік, галоўны інжынер Пётр Салаўёў. Сярод дэлегатаў — галоўны ўрач дзіцячай абласной бальніцы Ігар Каско, мастацкі кіраўнік аркестра народных інструментаў імя Л. Іванова і яго галоўны дырыжор Мікалай Алданаў, першы сакратар абласнога камітэта Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі Павел Алекса, муляр будтрэста №17 Аляксандр Бык, студэнт 3-га курса МДУ імя А. Куляшова Аляксандр Бельскі.

— Усебеларускі народны сход — знакавая падзея для ўсей краіны, таму што тут падводзяцца вынікі таго, што зроблена, і вызначаюцца перспектывы, — падзяліўся меркаваннем студэнт МДУ Аляксандр Бельскі. Малады чалавек сваю пуцёўку на рэспубліканскі сход заваяваў поспехамі ў вучобе і актыўнай пазіцыяй у грамадскай дзейнасці. — Вельмі важна, каб грамадства кансалідавана падышло да гэтай падзеі. Я, як студэнт, больш зацікаўлены станам нашай вышэйшай адукацыі, паколькі зараз стаўка робіцца на прафесіяналаў, якія могуць увасобіць пастаўленыя мэты ў жыццё. У рамках гэтага мы павінны ўдасканаліць сваю сістэму, паколькі ўступілі ў Балонскі працэс. Але трэба захаваць свае нацыянальныя традыцыі — простае капіяванне заходняга вопыту поспеху не прынясе. Мы павінны абдумана падыходзіць да гэтага, апрабаваць, не адмяжоўвацца ад свету, ісці ў адну нагу з ім, быць наватарамі ў шэрагу сфер, каб забяспечыць прагрэсіўнае і ўстойлівае развіццё сваёй краіне.

Ганаровым правам лічыць для сябе пабываць на Усебеларускім народным форуме першы сакратар абласнога камітэта Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі Павел Алекса.

— Прыемна, што ад горада вылучана шмат маладых людзей, — кажа ён. — Асабіста для мяне важна прадстаўляць інтарэсы нашай арганізацыі на рэспубліканскім узроўні, а ўсё там пачутае данесці да нашай моладзі. Сёння абласная арганізацыя налічвае прыблізна 60 тысяч чалавек. Мы змаглі аб'яднаць вакол сябе вялікую колькасць таленавітай, адоранай моладзі, далі магчымасць праявіць ім свае лідарскія якасці. За 5 гадоў рэалізавана шмат маштабных акцый і праектаў. На новы этап выйшаў праект «100 ідэй для Беларусі». Яшчэ 4 гады таму ў нас было 10-15 праектаў ад вобласці, зараз больш за 200. Ёсць зрухі па другаснай занятасці. Калі ў 2011 годзе праз студэнцкія атрады праходзілі 8 тысяч чалавек, то летась ужо 12,5 тысячы. І гэта датычыцца толькі аплачваемай формы занятасці, без уліку валанцёрскіх атрадаў. З мінулага года ў нашых установах аховы здароўя працуюць яшчэ і маладзёжныя медыцынскія атрады. Актыўна развіваецца міжнароднае супрацоўніцтва з Казахстанам, рознымі рэгіёнамі Расійскай Федэрацыі, Кітаем. Шмат мерапрыемстваў накіраваныя на творчую самарэалізацыю моладзі — «Уладар сяла», «Студэнт года», «Каралева вясна», «Бітва дыджэяў». Але ўсё, што мы робім, чым можам ганарыцца, было б нерэальна без падтрымкі кіраўніцтва краіны, органаў улады на месцах, усіх тых, хто разумее: лепшыя інвестыцыі ў будучыню — гэта моладзь. Радуе, што ў нас шмат актыўнай моладзі, бескарыслівай, якая разумее сваё дачыненне да будаўніцтва той краіны, у якой яна жыве. Нам не ўсё роўна, што адбываецца ў дзяржаве, дзе мы жывём.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.** *zigulya@zviazda.by*
**Фота аўтара**

■


## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОННЫХ ТОРГОВ ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА ОАО «СГЦ «Западный»

| Номер лота | ЛОТ № 1 | ЛОТ № 2 | ЛОТ № 3 | ЛОТ № 4 |
|---|---|---|---|---|
| Наименование объекта | Капитальное строение (инв. №100/С-73627) – жилой дом, общ. пл. 23,9 м², расположенное на зем. участке пл. 0,2368 га | Капитальное строение (инв. №100/С-73093) – жилой дом, общ. пл. 39,2 м², расположенное на зем. участке пл. 0,2500 га | Капитальное строение (инв. №100/С-73481) – жилой дом, общ. пл. 32,8 м², расположенное на зем. участке пл. 0,2212 га | Капитальное строение (инв. №100/С-44908) – жилой дом, общ. пл. 62,0 м², расположенное на зем. участке пл. 0,1297 га |
| Местонахождение объектов | Брестская обл., Брестский р-н, Мотыкальский с/с, д. Вельямовичи, ул. Советская, 67-А | Брестская обл., Брестский р-н, Радваничский с/с, д. Малые Радваничи, ул. Юбилейная, 31 | Брестская обл., Брестский р-н, Мотыкальский с/с, д. Вельямовичи, ул. Советская, 15 | Брестская обл., Брестский р-н, Мотыкальский с/с, д. Чилеево, 15 |
| Начальная цена продажи, руб. без НДС | 35 613 000 | 60 432 000 | 47 079 000 | 65 428 000 |
| Размер задатка, руб. | 2 695 200 | 2 695 200 | 2 695 200 | 2 695 200 |
| Условия продажи | Без условий | | | |
| Продавец (Балансодержатель) | ОАО «СГЦ «Западный» | | | |
| Организатор торгов | РУП «Жилкоммунтехника» Филиал «Центр «Белтехинвентаризация» Брестское областное управление | | | |
| Срок заключения договора купли-продажи | Не позднее 10 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов | | | |
| Условия оплаты | Оплата производится в соответствии с заключенным договором купли-продажи | | | |
| Номер р/с для перечисления задатка | р/с 3012105618108 в региональной дирекции №700 ОАО «БПС-Сбербанк» по г. Минску, код 369, УПН 102353509 | | | |

**Аукцион состоится 23 июня 2016 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325.**
**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10, каб. 329 с 9.00 до 17.00.**
**Сведения о документах, которые необходимо предоставить для участия в аукционных торгах, можно узнать у организатора аукционных торгов по телефонам: 8-(0162)-20-92-13, 21-88-81, (029) 626-72-52. Последний день приема заявлений – 22 июня 2016 г. до 17.00.**